Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 19 (607) Пятніца, 4 чэрвеня 1965 г. Год выдання XVIII Цана 1 кап.

РУКІ ПРЭЧ АД В'ЕТНАМА!

Злачынная агрэсія імперыялістаў у Паўднёвым В'етнаме, пірацкія налёты на гарады і сёлы Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам не могуць не выклікаць абурэння і пратэстаў савецкіх людзей, усяго прагрэсіўнага чалавецтва. Выкладчыкі і студэнты нашага універсітэта салідарныя з мужным в'етнамскім народам, які вядзе гераічную барацьбу за свабоду і незалежнасць.

Чатырыста трыццаць трэцяя аўдыторыя. Сюды сабраліся выкладчыкі, беларускія, в'етнамскія, кубінскія студэнты, якія вучацца ў нашым універсітэце. У руках многіх лозунгі. «Рукі прэч ад В'етнама!»—чырвонымі літарамі напісана на адным з іх.

Мітынг пратэста супраць амерыканскай агрэсіі ў В'етнаме адкрыў сакратар парткома універсітэта А. Я. Бураўскі. Ён з абурэннем гаварыў аб новых чорных планах амерыканскай ваеншчыны, якая развярнула кампанію ядзернага шантажа супраць свабодалюбівага в'етнамскага народа:

— В'етнамцы ў сваёй барацьбе не адзінокі. На іх баку ўвесь лагер сацыялізма, народы ўсяго свету—і гэта значыць, што перамога будзе на баку В'етнама!

Студэнтка гістарычнага факультэта В. Сысун усхвалявана гаварыла аб цяжкім лёсе народа Паўднёвага В'етнама.

Народы ўсяго свету ніколі не даруюць амерыканскай ваеншчыне ўсіх тых злачынстваў, якія яны робяць на в'етнамскай зямлі. Амерыка, спыніся, апамятайся!. В'етнам будзе свабодным. Янкі, прэч з В'етнама!

— Мы патрабуем вываду амерыканскіх войск з Паўднёвага В'етнама, спынення злачыннай вайны! — гаворыць студэнт 3-га курса хімічнага факультэта Арландо Рэйноса. Яго голас гучыць, нібы рэха далёкай Кубы.

— Афрыка з табой, В'етнам!—запэўніў пасланец з Ганы, студэнт першага курса Джон Флетчэр.

Са словамі глыбокай удзячнасці выступіў в'етнамскі студэнт Нгуен Мінь.

Выкладчыкі і студэнты універсітэта рашуча і адзінадушна асуджаюць жудасныя злачынствы амерыканскага імперыялізма ў В'етнаме і патрабуюць спыніць брудную вайну.

Савецкі народ, усё прагрэсіўнае чалавецтва на баку мужнага в'етнамскага народа. Амерыканскія агрэсары бяссільны супраць вызваленчых народных сіл, і таму звяртаюцца да зверстваў, якіх не ведалі нават самыя змрочныя часы чалавечай гісторыі. Але ім не паставіць мужны в'етнамскі народ на калені. Савецкія людзі аказваюць і будуць аказваць дапамогу Дэмакратычнай Рэспубліцы В'етнам у барацьбе з амерыканскай агрэсіяй, у дасягненні канчатковай перамогі.

У прынятай на мітынгу рэзалюцыі выкладчыцкі калектыў і студэнты універсітэта выказалі сваю брацкую салідарнасць са змагаючымся народам В'етнама, патрабавалі накласці канец амерыканскай агрэсіі ў Індакітаі.

Ю. АГАРАДНІЧЭНКА.

НА ЗДЫМКАХ: (уверсе) прэзідыум мітынга пратэсту супраць амерыканскай агрэсіі ў Паўднёвым В'етнаме.

(Справа) — дружнымі апладысментамі сустракае зал гарачыя словы прамоўцаў.

УЛ. І. ЛЕНІНУ АД БДУ

У Крамлі, у асабістай бібліятэцы Ул. І. Леніна захоўваецца больш дзесятка кніг, напісаных супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Усе яны, у аснoўным, выдадзены ў Мінску. Тры з іх—даравальныя экзэмпляры Белдзяржуніверсітэта, аб чым гавораць надпісы на іх тытульных лістах?

Узнікненне Беларускага дзяржаўнага універсітэта звязана з імем Уладзіміра Ільіча Леніна. У 1919 годзе, 28 студзеня, быў апублікаваны падпісаны Ул. І. Леніным дэкрэт Савета Народных Камісараў, у якім гаварылася: «У азнаменаванне Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года, якая разняволіла працоўныя масы ад эканамічнага, палітычнага і духоўнага прыгнёту з боку маёмасных класаў і адкрыла ім шырокія дарогі да крыніц ведаў і культуры, стварыць дзяржаўныя універсітэты...» 11 ліпеня 1921 года на сходзе грамадскасці сталіцы Беларусі, прысвечаным адкрыццю універсітэта, яго ўдзельнікі сваё першае прывітанне паслалі Ільічу. Яны пісалі: «Адкрываючы ў дзень вызвалення Мінска—сталіцы Беларусі—Беларускі дзяржаўны універсітэт, урачысты сход, прысвечаны яго адкрыццю, ад імя партыйных, рабочых, культурных і грамадскіх сіл краю шле Вам, дарагі правадыр, сваё гарачае прывітанне».

У 1922 годзе, падагульняючы першы навучальны год, члены праўлення універсітэта прафесар С. З. Кацэнбогін склаў невялікую (40 стар.) кнігу «Беларускі дзяржаўны універсітэт за 1921—22 акадэмічны год». У тым жа годзе кніга была выдадзена Дзяржвыдавецтвам Беларусі, а адзін з першых яе экзэмпляраў паслалі ў Маскву з надпісам на тытульным лісце «Уладзіміру Ільічу Леніну ад Беларускага дзяржаўнага універсітэта». Дакладна з такім жа надпісам захоўваецца ў бібліятэцы Ул. І. Леніна першы выпуск кнігі «Працы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў Мінску». Гэтая кніга выдадзена ў тым жа 1922 годзе невялікім тыражом. Наступны (№ 2—3) выпуск «Прац Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў Мінску» таксама ёсць у бібліятэцы Ул. І. Леніна з кароткім надпісам на тытульным лісце: «Ул. І. Леніну ад БДУ». Гэты выпуск выйшаў у свет 30 кастрычніка 1922 года.

Сярод іншых кніг у бібліятэцы Ільіча ёсць брашура С. Я. Вальфсона пра жыццё і дзейнасць Г. В. Пляханава «Вялікі сацыяліст», выдадзеная ў 1922 годзе ў Мінску і 2-е выданне кнігі таго ж аўтара «Дыялектычны матэрыялізм». Яна ўяўляе сабой курс лекцый, прачытаных на факультэце грамадскіх навук БДУ. Ёсць там і «Нарысы беларускай літаратуры» прафесара БДУ М. А. Янчука, і кнігі рэктара БДУ прафесара В. І. Пічэты, і дзве кнігі М. М. Нікольскага.

У 1922 годзе ў Мінску быў выдадзены зборнік артыкулаў выдатнага нямецкага публіцыста сацыял-дэмакрата Франца Мерынга пад назвай «На філасофскія і літаратурныя тэмы». Пераклаў артыкулы з нямецкай на рускую мову беларускі мастацтвазнаўца М. М. Шчакаціхін. Уступны артыкул да зборніка напісаў С. Я. Вальфсон. Гэтая кніга таксама ёсць у бібліятэцы Ул. І. Леніна.

М. КАМІНСКІ.
(«Літаратура і мастацтва» № 32, 1965 г.).

★ ★

Нядаўна ў нашым універсітэце пабываў міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР В. П. Ялюцін. Ён агледзеў памяшканні галоўнага корпуса, кафедры і лабараторыі фізічнага факультэта. Пасля адбылася сустрэча супрацоўнікаў універсітэта з міністрам.

А 31 мая адбылася нарада актыву работнікаў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы рэспублікі. У ёй прынялі ўдзел рэктары, прарэктары, дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедраў, прафесары вну, дырэктары сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, работнікі, абласных і гарадскіх камітэтаў КПБ, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў, сакратары партыйных арганізацый і старшыні прафсаюзных камітэтаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Нараду адкрыў сакратар ЦК КПБ В. Ф. Шаура.

З дакладам аб чарговых задачах вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў выступіў міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР В. П. Ялюцін.

ПЕРШЫЯ ПЛЮСЫ І МІНУСЫ

Усё часцей зараз можна ўбачыць студэнтаў ля дзвярэй аўдыторый, дзе лаканічны надпіс папярэджвае: «Ціха, ідуць экзамены!» Студэнты таропка перагортваюць канспекты: «каб не забыць чаго?» Хвалююцца ўсе. Каму з студэнтаў не знаёма гэтае хваляванне перад залікамі і экзаменамі?

Давайце пройдземся па факультэтах...

На гістарычным справы пакуль што ідуць добра. Першакурснікі пісалі курсавыя работы па гісторыі Грэцыі і Рыма, на «выдатна» выканалі Л. Цыбарава, М. Зайцаў, Я. Калеснік, А. Ляонаў—усяго пятнаццаць чалавек з адной толькі першай групы.

На «выдатна» напісалі курсавыя работы і студэнты чацвертага курса гэтага факультэта М. Гарэлік, В. Раманчук, В. Жукаў.

На біяфаку таксама пачынаецца гарачая пара. Так, студэнты першай групы трэцяга курса здавалі экзамен па фізіялогіі раслін. З дваццаці чалавек сем здалі на «выдатна», астатнія на «добра» і толькі В. Камянчук атрымаў «здавальняюча».

Добра здалі свой першы экзамен па арганічнай хіміі студэнты пятага курса хімічнага факультэта — дзевяць «выдатна»; сем—«добра». На заліку па курсу «палімеры» асабліва добрую падрыхтоўку паказалі студэнты Аскерка, Герасімаў, Рагожкіна.

Многія студэнты геаграфічнага факультэта хутка едуць на практыку. У навуковую экспедыцыю па вывучэнню азёр Беларусі накіроўваюцца другакурснікі. Сесію яны здавалі датэрмінова. Студэнт В. Ярцаў усе экзамены здаў на «выдатна». «Добра» і «выдатна» з'явілася ў заліковых кніжках Бубені, Гарбалені, Кулікоўскага і іншых.

Аднак ёсць ужо і такія, хто атрымаў «нездавальняюча». К. Журомская з чацвертага курса геафака здала чатыры экзамены. Вынік даволі сумны—2 «нездавальняюча» і 2—«здавальняюча», па «двойцы» маюць таксама Г. Савіч, Г. Піскаровіч.

У цэлым жа на ўсіх факультэтах студэнты здаюць экзамены паспяхова. Ужо цяпер можна меркаваць, што «нездавальняючых» у гэтым годзе будзе менш, чым у мінулыя гады.

Ф. БАНДАРОВІЧ.

ВЫНІКІ РАДУЮЦЬ

На экзамены па палітычнай эканоміі (капіталістычны спосаб вытворчасці) студэнты трэцяга курса хімфака ішлі ўпэўнена. І не дзіўна. На працягу семестра яны акуратна наведвалі лекцыі дацэнта С. Янчанкі, не прапускалі семінараў. З 30 студэнтаў групы на кожным з семінарскіх заняткаў прысутнічалі звычайна ўсе 30 чалавек, а калі хто і адсутнічаў, дык толькі па ўважлівай прычыне.

Амаль на кожным семінары выступалі студэнткі Аня Кучук, Ала Балуха, Вера Шапавалава, Валя Пракопчык, Валя Дзенскевіч і іншыя. Якой бы складанай ні была тэма: разглядаліся законы таварнай вытворчасці ці ўмовы рэалізацыі пры простым і расшыраным узнаўленні—іх адказы заўсёды радавалі выкладчыка разуменнем эканамічных узаемасувязей, глыбінёй і змястоўнасцю. У ходзе заняткаў у студэнтаў узнікала шмат пытанняў. Усе яны разбіраліся і высвятляліся. Ніколі студэнты не пакідалі аўдыторыі, дзе праходзілі семінарскія заняткі, незадаволенымі.

І вось падведзены вынікі. Ніводнага правала. Усе студэнты групы атрымалі станоўчыя адзнакі. А большасці было запісана у заліковыя кніжкі «выдатна» і «добра». Заслужаныя «пяцёркі» атрымалі Ала Балуха, Люба Крысько, Вера Шапавалава. З такім поспехам групу можна толькі шчыра павіншаваць.

Ул. БЛАКІТНЫ.



НА ЗДЫМКУ: выступае танцавальны калектыў.

У ДОБРЫ ЧАС, СЯБРЫ!

Навучальны год быў, як ніколі, паспяховым у развіцці мастацкай самадзейнасці універсітэта. Нашым самадзейным артыстам даводзілася выступаць перад шматлікімі аўдыторыямі слухачоў. Іх выступленні цёпла сустракалі працоўныя Мінска, хлебаробы раёна, школьнікі і студэнты. Ад працаўнікоў сяла самадзейныя артысты атрымалі прэмію—250 рублёў.

Першы поспех быў адзначан на аглядзе мастацкіх калектываў Ленінскага раёна сталіцы. Потым гарадскі агляд народных талентаў. З цікавасцю гледачы сустракалі выступленні танцавальнага калектыва, аркестра народных інструментаў, народнай харавой капэлы, а таксама майстроў мастацкага слова В. Герасімава (2-гі курс філфака), Т. Галынка (1-ы курс гістфака) і іншых. Яны атрымалі граматы і дыпломы другой ступені. У выніку гэтага агляда на трэцюю дэкаду мастацкай самадзейнасці рэспублікі былі вылучаны тры калектывы ад нашага універсітэта: танцавальны, аркестр народных інструментаў і народная харавая капэла. Аркестр народных інструментаў завяваў права выступіць у заключным канцэрце трэцяй дэкады.

Доўгая і старанная праца гэтага калектыва была адзначана на аглядзе дыпломам 2-ой ступені.

Мастацкая самадзейнасць нашага універсітэта заняла першае месца сярод вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Добры поспех! Але трэба яшчэ многа напрацаваць, каб у далейшым гэтае месца замацавалася за намі.

Цішыня пануе цяпер у актавай зале. Ідзе сесія, а нашы артысты звычайныя студэнты! І мы ўпэўнены, што і сесія для іх будзе таксама паспяховай.

У добры час, сябры!

Г. ФРАЛОВІЧ.

ПРАЦАВАЦЬ З АГЕНЬЧЫКАМ

Ідзе летняя сесія. Гэта бачна і па перапоўненых бібліятэках і чытальных залах, і па заклапочаных тварах студэнтаў. Пытанне: «Ну колькі?» — стала цяпер самым распаўсюджаным. Радасна ўсміхаюцца сябры, калі чуюць адказ: «Пяцёрка!» І кожнаму хочацца таксама здаць экзамен як мага лепей, каб не адстаць ад сваіх сяброў. Так, адзнака ў заліковай кніжцы — узнагарода за старанную вучобу ў час семестра. Добра, калі гэтая адзнака «выдатна»!

Ідзе сесія. А вось для журналістаў-першакурснікаў, што едуць на цаліну, яна ўжо закончылася. Толькі на «выдатна» і «добра» закончылі яны навучальны год. Шчаслівай дарогі вам, хлопцы!

У гэты гарачы час асабліва ўзрастае роля работы камсамольскага бюро сярод студэнтаў. «Кожная гадзіна, кожная хвіліна павінны быць на ўліку. І ўвесь час трэба скарыстаць з самай максімальнай аддачай», — гаворыць загадчык акадэмічнага сектара Ірына Шымко. Пра работу гэтай дзяўчыны нельга не расказаць. Зусім нядаўна пачала яна працаваць у акадэмічным сектары камсамольскага бюро філалагічнага факультэта, але колькі ўжо зроблена за гэты час! Яна наладзіла заняткі са студэнтамі ў групах, аформіла стэнд уліку наведвання лекцый студэнтамі, сама часта гутарыць з тымі, хто спазняецца на лекцыі. Вынікі штодзённай стараннай работы Іры бачны ўжо зараз.

Фарміруецца будаўнічы атрад на будоўлі Беларусі. На нядаўна прайшоўшым пасяджэнні камсамольскага бюро філфака былі вылучаны: камандзір будаўнічага атрада — Валя Сіманава з 1-га курса рускага аддзялення, камісар-Таня Таранда з 1-га курса беларускага аддзялення.

У працоўным сектары цяпер рыхтуецца план работы на стадыёне. Кожнаму камсамольцу будзе дадзена асабістае заданне.

Многа ўвагі ўдзяляе бюро пытанню новага прыёма ва універсітэт. Журналісты, якія былі на практыцы ў шматтыражных газетах мінскіх заводаў, правялі вялікую агітацыйную работу сярод моладзі. Яны расказвалі аб гісторыі нашага універсітэта, аб тым, якіх спецыялістаў рыхтуе ён.

У сельскіх школах Беларусі гэтую ж работу праводзілі студэнты-чацверакурснікі філфака, якія праходзілі там практыку.

Уся гэтая прапагандысцкая работа накіравана на тое, каб у гэтым годзе ва ўніверсітэт прыйшла вучыцца здольная, сапраўды ўлюбёная ў выбраную прафесію моладзь.

У час сесіі правяраюцца здольнасці камсамольскіх актывістаў працаваць са студэнтамі. Працаваць творча, падзелавому — вось асноўная, характэрная рыса камсамольскага важака. Выклікае незадаволенасць тое, што ў бюро часам трапляюць выпадковыя людзі, няздольныя весці работу, у якіх няма ні ўмення, ні жадання працаваць з камсамольцамі. Не праверыўшы чалавека, як ён вучыцца, як да яго адносяцца таварышы, які ён мае аўтарытэт сярод студэнтаў, нельга даваяраць адказную работу ў бюро. Так здарылася са студэнткай М. Хомчанка. Памылкова трапіла яна ў члены камсамольскага бюро. У свой час бюро не прыслухалася да заўвагі камсамольцаў. Яна часта прапускала заняткі, без прычыны. З першых дзён работы паказала сябе з адмоўнага боку. Ёй даручылі працаваць з піянерважатымі прыдомакіраўніцтвах, але яна не выканала гэтага даручэння.

Добра тое, што бюро своечасова заўважыла, што М. Хомчанка запусціла работу. Яго рашэннем яна была вызвалена ад абавязкаў члена камсамольскага бюро філфака.

Са здавальненнем можна адзначыць, што цяпер работа сярод важатых вядзецца паспяхова. Оля Буланчыкава, якой даручылі гэты сектар, працуе добра.

Так, у працэсе работы камсамольскага бюро, выпраўляюцца недахопы, прапагандуецца ўсё новае, перадавое, растуць людзі. І верыцца, што цяпер камсамольскае бюро павядзе належную работу сярод студэнтаў. Гэта ўжо бачна зараз. Добрае ў рабоце бюро сустракае шырокую падтрымку з боку ўсіх студэнтаў філалагічнага факультэта. «Працаваць з агеньчыкам, пераадольваць усе перашкоды на сваім шляху»,— вось дэвіз кожнага члена камсамольскага бюро.

З. СЯРГЕЕЎ.

БІБЛІЯТЭКА—СТУДЭНТАМ

Экзаменацыйная сесія з'яўляецца праверкай ведаў не толькі студэнтаў, але і свайго роду аглядам работы бібліятэкі на працягу ўсяго навучальнага года. Уся наша ўвага накіравана на паляпшэнне абслугоўвання чытачоў, на садзейнічанне выкладчыкам у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў. Камплектаванне літаратуры робіцца з улікам патрэб студэнтаў. Каб неабходныя кніжкі былі бліжэй да студэнтаў, работнікі бібліятэкі перадаюць іх у кабінеты. Напрыклад, уся літаратура па праграме курса гісторыі КПСС знаходзіцца ў кабінеце.

Для спецыяльных груп, якія вывучаюць замежную мову, мы арганізавалі з ліку работнікаў бібліятэкі групу. Яна падрыхтавала патрэбную літаратуру для навуковай працы — 3—5 курсаў і вучэбнай 1—2. Укамплектаван і сістэматычна папаўняецца новай літаратурай кабінет навуковага камунізма. Тут студэнты могуць атрымаць патрэбную літаратуру ў дастатковай колькасці.

Калектыў нашай бібліятэкі змагаецца за званне калектыва камуністычнай працы. Сацыялістычныя абавязацельствы мабілізуюць работнікаў бібліятэкі на яшчэ лепшую работу. Бібліятэка часта праводзіць цікавыя канферэнцыі па кнігах пісьменнікаў, дыспуты, бібліяграфічныя агляды. А такія выстаўкі, як «Подзвіг народа», «Вобраз Ул. І. Леніна ў беларускай літаратуры», «Дзень радыё» спадабаліся нашым чытачам. Вельмі часта мы праводзім бібліятэчна-бібліяграфічныя заняткі. Яны даюць магчымасць студэнтам больш поўна выкарыстоўваць кніжны і часопісны фонд нашай бібліятэкі.

Г. ЛЮБІНА,
загадчыца бібліятэкі БДУ.

У вольны час.

ПА КРАІНЕ САВЕТАЎ

ЧАЙНВОРД.



1. Сталіца саюзнай рэспублікі. 2. Горы на граніцы Еўропы і Азіі. 3. Горад-герой. 4. Абласны цэнтр у УССР. 5. Самы паўднёвы горад Савецкага Саюза. 6. Порт на Белым моры. 7. Горад, ля якога будуецца адна з буйнейшых у свеце ГЭС. 8. Прыток Волгі. 9. Возера на граніцы Казахстана і Узбекістана. 10. Курортны горад у Крыме. 11. Паўвостраў на поўначы СССР. 12. Абласны цэнтр у РСФСР. 13. Порт на Балтыйскім моры. 14. Рака ў Беларусі. 15. Адміністрацыйна - тэрытарыяльная адзінка. 16. Горад, з якім звязана нараджэнне Чырвонай Арміі. 17. Саюзная рэспубліка. 18. Рака басейна мора Лапцевых. 19. Адміністрацыйны цэнтр Хакасіі. 20. Самае вялікае возера Беларусі. 21 Дзяржава, з якой мяжуецца СССР. 22. Старая назва ракі Урал. 23. Паўвостраў на поўдні краіны. 24. Горад, дзе праходзіў І з'езд РСДРП. 25. Сталіца Тувінскай АССР. 26. Буйнейшае возера Еўрапейскай часткі СССР.

Склаў У. БАРАНАЎ.

РАІМ ПРАЧЫТАЦЬ

«УЛ. І. ЛЕНІН АБ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОЦЕ» (зборнік артыкулаў) Дзяржпалітвыдавецтва, 1965 год. Тут сабраны найбольш важныя выказванні Ул. І. Леніна аб камуністычным выхаванні, розных баках ідэалагічнай работы, яе ўдарных сродках. Асобныя раздзелы зборніка прысвечаны прапагандысцкаму майстэрству. Кніга вельмі карысная для выкладчыкаў і студэнтаў, для ўсіх работнікаў ідэалагічнага фронту.

«РАДЫЁ і ТЭЛЕБАЧАННЕ Ў СССР». М. Глейзер. М. 1965 год. У кнізе прыводзяцца даты і факты з гісторыі радыё нашай краіны з першага дня Кастрычніцкай рэвалюцыі да канца 1963 года, а таксама гісторыя нараджэння і развіцця савецкага тэлебачання. Чытач даведаецца пра важнейшыя падзеі ў жыцці савецкай дзяржавы, пра тое, як яны асвятляліся сродкамі радыё і тэлебачання. Змешчаны цікавыя здымкі: Ул. І. Ленін перад мікрафонам у аддзеле грамафоннай прапаганды цэнтра друку — 1919 год; А. М. Горкі слухае праз навушнікі радыё; М. І. Калінін выступае па тэлебачанню ў 1939 годзе; Рамэн Ралан ля мікрафона Маскоўскага радыё (1935 г.); А. С. Серафімовіч у радыёстудыі (1943 год) і многія іншыя.

«АРКАДЗЬ ГАЙДАР НА УРАЛЕ» С. Гіну і Б. Назароўскі, выд. 1965 года.

Гэта старонкі з біяграфіі вядомага пісьменніка і публіцыста. Яны апавядаюць пра першую грамадзянскую спецыяльнасць А. Гайдара — журналісцкую дзейнасць.

«ГЭТА — ЖЫЦЦЁ». А. Кананенка. Выдавецтва «ПРАВДА», 1965 год.

Савецкім чытачам добра вядома імя Алены Кананенка, таленавітай публіцысткі, спецыяльнага карэспандэнта «ПРАВДЫ». Яе новая кніга — гэта апавяданні і нарысы пра нашых сучаснікаў, людзей, што здзяйсняюць нашу рэчаіснасць. Мары, праца, лёс чалавека, каханне, дзеці — усё знайшло адлюстраванне ў названай кнізе. Таму яна не можа не зацікавіць самыя шырокія колы чытачоў.

«ФАКЕЛ НАД ЛЕСАМ», Н. Конанава, выдавецтва «Беларусь» 1964 год.

Тут сабраны нарысы аб лепшых людзях нашай рэспублікі. Аўтар, старэйшая беларуская журналістка, дзеліцца з чытачом сваімі думкамі і назіраннямі над сучасным жыццём, заклікае сумленнай працай памнажаць багацці Радзімы.

«НАША БІБЛІЯТЭКА». Выдавецтва «Кніга» М. 1964 год.

З яе вы даведаецеся пра тое, якім цудам з'яўляецца кніга, як ёй лепш карыстацца, як з вялікай колькасці кніг можна хутчэй выбраць патрэбную. Напісана кніга журналістамі А. Глухавым, І. Іназемцавым сумесна з бібліятэкарамі І. Лаўрыновічам, Е. Фадзеевай, Н. Фернандэс.

В. а. рэдактара П. І. ТКАЧОЎ.

АТ 00915 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19. Друкарня Выдавецтва «Звязда» Тыр. 2000. Зак. № 665.